УДК 394:379.82:316.7

# Метады адлюстравання народных абрадаў у дзейнасці ўстаноў культуры

**Петухова Н.В.**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

*Папулярызацыя масавай культуры прыводзіць да паступовага знікнення старажытнай абрадава-святочнай спадчыны з побыту людзей. Вядучую ролю ў яе захаванні выконваюць установы культуры, якія ладзяць народныя святы, дзякуючы якім узнаўляюцца старажытныя абрады і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў вольны час.*

*Мэта артыкула — ахарактарызаваць метады адлюстравання народных абрадаў у дзейнасці ўстаноў культуры.*

*Аўтарам разгледжаны метады рэстаўрацыі, рэканструкцыі і трансфармацыі. Кожны з іх адлюстроўвае спосаб працы супрацоўнікаў устаноў культуры з фальклорным матэрыялам і накірунак арганізацыі свята. Метад рэстаўрацыі служыць натуральнаму ўзнаўленню першапачатковага зместу і форм абрадава-святочных дзеянняў у прасторы і часе з удзелам носьбітаў фальклору. Метад рэканструкцыі накіраваны на даследаванне рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнага абраду, дакладнае вывучэнне песень, танцаў, моўных выказванняў і інш. складнікаў драматургічнай асновы дзеяння, а таксама яго аднаўленне з улікам тэмпаральнага, акцыянальнага, лакатыўнага, атрыбутыўнага, персанальнага, музычнага і вербальнага кодаў. Метад трансфармацыі адлюстроўвае эстэтычнае пераасэнсаванне абрадава-святочнай культуры зыходзячы з умоў сцэны. У адрозненне ад метадаў рэстаўрацыі і трансфармацыі, ён дазваляе пераўтварыць вербальныя схемы, лепей прадэманстраваць мастацка-вобразныя асаблівасці традыцыйнага абраду.*

***Ключавыя словы:*** *фальклор, свята, культура, нематэрыяльная культурная спадчына, народны, метад, рэстаўрацыя, рэканструкцыя, трансфармацыя, мерапрыемства, рытуал, мастацтва, творчасць.*

*(Искусство и культура. — 2026. — № 1(61). — С. 73–77)*

# Methods of the Implementation of Folk Rituals in the Activities of Culture Institutions

**Petukhova N.V.**
*Education Establishment “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk*

*The popularization of mass culture leads to the disappearance of the ancient ritual and festive heritage from people’s everyday life. The leading role in its preservation is played by culture institutions, which organize folk holidays, where ancient rituals are recreated and favorable conditions are created for the implementation of social and cultural activities of the population in their free time.*

*The purpose of the article is to characterize the methods of implementing folk rituals in the activities of culture institutions.*

*The article examines the methods of implementing folk rituals: restoration, reconstruction and transformation. Each of the methods reflects the way employees of cultural institutions work with folk material and the direction of the holiday organization. The restoration method involves the natural reproduction of the original content and form of ritual and festive actions in space and time with the participation of folklore bearers. The reconstruction method is aimed at studying the regional features of the traditional rite, the precise study of songs, dances, linguistic expressions, etc., which form the drama basis of the action, and its restoration taking into account temporal, actional, locative, attributive, personal, musical and verbal codes. The transformation method reflects an aesthetic reinterpretation of ritual and festive culture for the conditions of the stage. Unlike restoration and transformation methods, it is aimed at transforming verbal schemes and artistic and figurative features of the traditional rite.*

***Key words:*** *folklore, holiday, culture, intangible cultural heritage, folk, method, restoration, reconstruction, transformation, event, ritual, art, creativity.*

*(Art and Cultur. — 2026.— № 1(61).— P. 73–77)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: shakhan@yandex.ru — Н.В. Петухова*

Народныя абрады займаюць значнае месца ў святочнай культуры нашай краіны. Аднак папулярызацыя масавай культуры прыводзіць да паступовага знікнення старажытнай абрадава-рытуальнай спадчыны з побыту людзей. Таму ўзрастае неабходнасць дэталёвага вывучэння народных традыцый і іх падтрымання праз арганізацыю мерапрыемстваў, якія адлюстроўваюць паўнаводную плынь народнай творчасці, дэманструюць узровень мастацкай асэнсаванасці той ці іншай фальклорнай з'явы.

Вядучую ролю ў захаванні і распаўсюджванні нацыянальных каштоўнасцей выконваюць установы культуры: цэнтры народнай творчасці, палацы культуры, дамы рамёстваў, цэнтры нацыянальных культур, клубныя ўстановы і інш., якія штогод ладзяць народныя святы, дзякуючы якім узнаўляюцца старажытныя абрады і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў вольны час. На Беларусі паўсюдна праводзяцца «Дажынкі», «Купалле», «Масленіца», «Вялікдзень», адраджаюцца святы «Камаедзіца», «Провады русалкі», «Гуканне вясны», «Свяча», «Багач» і інш. Аднак часам захапленне сцэнічна эфектным матэрыялам, арыентацыя абрадавых пастановак пераважна на канцэртнае выкананне прыводзяць да парушэнняў у аднаўленні фальклорных узораў і да культурнай дэзадаптацыі насельніцтва. Губляецца першапачатковы сэнс народных абрадаў, іх рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці, нівеліруюцца адмысловыя манеры выканання фальклорных твораў.

Ліквідацыі гэтага недахопу і эфектыўнаму вырашэнню важнай культурна-асветніцкай задачы захавання традыцыйных і пошуку новых форм увасаблення народных абрадаў у кантэксце сучаснай культуры прысвечаны працы тэарэтыкаў айчыннай рэжысуры народных абрадаў і свят А.М. Аляхновіча, П.А. Гуда, А.Я. Камінскага; фалькларыстаў-філолагаў Г.А. Барташэвіч, А.С. Ліса, В.Д. Ліцвінкі, Р.М. Кавалёвай; этнамузыколагаў Т.Б. Варфаламеевай, З.Я. Мажэйкі; філосафа Э.К. Дарашэвіча, культуролагаў В.Л. Гуцько, В.В. Калацэя. Навуковы аналіз дадзеных прац і практычны досвед аўтара артыкула дазваляе вылучыць наступныя метады адлюстравання народных абрадаў — рэстаўрацыя, рэканструкцыя і трансфармацыя.

Мэта дадзенага артыкула — ахарактарызаваць метады адлюстравання народных абрадаў у дзейнасці ўстаноў культуры.

Матэрыялам для правядзення даследавання з'яўляецца асабісты дваццацігадовы вопыт аўтара ўдзелу ў фальклорных імпрэзах. Яго вынікі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе кафедры рэжысуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пры арганізацыі свят рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Матэрыялы даследавання маюць практычнае значэнне для напісання дыпломных работ, распрацоўкі падручнікаў і вучэбна-метадычных комплексаў для ўстаноў вышэйшай адукацыі — для навучання студэнтаў па спецыяльнасці «рэжысура прадстаўленняў і свят».

Аўтарам выкарыстаны тэарэтычныя метады (сістэматызацыя, класіфікацыя, параўнальны аналіз, сінтэз, абагульненне), аналіз творчай дзейнасці ўстаноў культуры ў галіне арганізацыі народных свят.

**Метад рэстаўрацыі.** Прафесар Э.К. Дарашэвіч даволі грунтоўна разглядае метад рэстаўрацыі народных абрадаў у манаграфіі «Тэорыя фальклору» [1], у якой аналізуе яго згодна з Канвенцыяй аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO [2]. Наша краіна адна з першых далучылася да гэтага міжнароднага дакумента, які быў зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2004 г. № 627. Згодна з пунктам 1 артыкула 2 Канвенцыі, міжнароднай супольнасцю ў якасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны прызнаюцца «практыкі, формы падачы і выражэння, веды і навыкі, — а таксама звязаныя з імі інструменты, аб'екты, артэфакты і культурныя прасторы, — прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая перадаецца пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў залежнасці ад навакольнага асяроддзя, іх узаемадзеяння з прыродай і іх гісторыяй, і фарміруе ў іх пачуццё ідэнтычнасці і пераемнасці, садзейнічаючы тым самым павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека» [3]. Такія аб'екты заносяцца ў Urgent Safeguarding List UNESCO і бяруцца пад ахову.

На дадзены момант у спіс, сярод іншых аб'ектаў, уключаны абрад «Тураўскі карагод» вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» вёскі Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, калядны абрад «Цары» аграгарадка Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Менавіта дадзеныя абрады можна назваць самым выразным прыкладам рэстаўрацыі.

Метад рэстаўрацыі (ад лац. restauratuo) прадстаўляе сабой «узнаўленне ранейшага першапачатковага зместу або формы частак

традыцыйнай абрадавай дзеі на аснове вуснапаэтычнага, музычнага, песеннага, харэаграфічнага матэрыялу, які захаваўся» [4, с. 95]. Ён характарызуецца тым, што, па-першае, у абраным для работы абрадзе абавязкова прымаюць удзел носьбіты фальклору; па-другое, ён працягвае існаваць у актыўнай, жывой форме, што прадугледжвае натуральнае выкананне абрадавых дзеянняў у прасторы і часе. Да ўдзелу ў свяце актыўна далучаюцца пераемнікі, якія «з голаса на голас», вусным шляхам пераймаюць ад носьбітаў фальклорныя ўзоры (песні, танцы, карагоды і інш.), засвойваюць славесныя кампаненты абраду (зычэнні, віншаванні, прамовы і г.д.). Такім чынам здзяйсняецца далучэнне маладога пакалення да народных традыцый.

Напрыклад, абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» штогод праводзіцца ў вёсках Казацкія Балсуны, Пералеўка, аграгарадках Янова, Неглюбка, Стаўбун Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Як распавядае метадыст па фальклоры Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці І.В. Глушэц, гэта свята ў першую чаргу скіравана на адвядзенне маланкі ад вёскі і закліканне дажджу для добрага ўраджаю. Завадатарамі яго правядзення з'яўляюцца ўдзельніцы фальклорнага ансамбля «Стаўбунскія вячоркі». Прыязджаюць на мерапрыемства шматлікія госці. Так, на працягу 10 гадоў да свята далучаюцца студэнты спецыялізацыі «этнафоназнаўства» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Разам з носьбітамі фальклору яны ўдзельнічаюць у святочным шэсці, водзяць карагоды, спяваюць песні, выконваюць рытуальныя дзеянні [5].

Акрамя таго, цягам 20 гадоў на Ушэсце да М.Л. Зуевай, мясцовай спявачкі, прыязджае са сталіцы Расіі фальклорны ансамбль «Народный праздник» пад кіраўніцтвам Я.С. Косцінай, які ўдзельнічае ў абрадзе. Трэба дадаць, што абрад, узяты пад ахову дзяржавы, мае статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці з 2006 года [5].

**Метад рэканструкцыі.** Асобныя святы і абрады беларусаў працягваюць існаваць у пасіўнай форме, калі ў памяці выканаўцаў захоўваюцца рэшткі старажытных вераванняў, звычаяў, аўтэнтычных песенных і харэаграфічных узораў і г.д. Часам, дзякуючы актыўнай збіральніцкай працы фалькларыстаў і мясцовых работнікаў культуры, традыцыйныя рытуальна-абрадавыя комплексы набываюць новае жыццё. Звычайна адраджэнне абрадава-рытуальных комплексаў на аснове рэшткаў фальклорных матэрыялаў, што былі захаваны, і этнаграфічнага апісання адбываецца пры дапамозе метада рэканструкцыі (ад лац. re = нанава + construction = пабудова) [4, с. 95]. Напрыклад, абрады «Грамніцы» і «Ваджэнне Маі» з вёскі Новае Палессе Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Яны былі адноўлены пры дапамозе трох мясцовых жыхароў, якія памяталі пра рытуальныя дзеі абрадаў.

Прыклады рэканструкцыі рытуальна-абрадавых комплексаў ёсць у Любанскім раёне Мінскай вобласці, дзе ўзорны фальклорны калектыў «Нашчадкі» Забалацкага СДК падтрымлівае традыцыю існавання абрада «Жаваронкі», які не мае аналагаў у Беларусі. Акрамя таго, комплекс абрадавых дзей на «Русальнай нядзеле» штогод абдываецца ў аграгарадках і вёсках Соснаўскага, Камунараўскага і Малагарадзяціцкага с/с: Сосны-1, Сосны-2, Малыя Гарадзяцічы, Загалле, Палічын, Кузьмічы, Камуна, Нежын [6, с. 98].

Метад рэканструкцыі традыцыйнага абраду прадугледжвае, у першую чаргу, дэталёвае даследаванне яго рэгіянальных і лакальных асаблівасцей, дакладнае вывучэнне песень, танцаў, моўных выказванняў і інш. складаючых драматургічнай асновы дзеяння. Для стварэння сцэнарнага плана рэканструкцыі народнага свята неабходна ўлічваць архітэктоніку кодаў (асноўных кампанентаў) яго правядзення, распрацаваную расійскімі навукоўцамі С.М. і М.І. Талстых. Яна выглядае наступным чынам: тэмпаральны код — час правядзення абраду (свята); акцыянальны код — паслядоўнасць абрадавых дзей (рытуал); лакатыўны код — месца правядзення абраду (свята); персанальны код — кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код — выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання; музычны код — тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментальнай музыкі; вербальны — наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў у абрадзе [3, с. 51].

Складанне сцэнара паводле вышэйпералічаных кодаў абрадавага свята дазваляе больш дэталёва акрэсліць ход абрадавых дзей і асобных эпізодаў, дакладна вызначыць час і месца іх правядзення, удакладніць кола ўдзельнікаў і завадатараў свята, абрадавых персанажаў, стварыць на падставе рэгіянальнага фальклору рэкрэацыйна-забаўляльную частку мерапрыемства.

Адно з такіх свят — «Каляды» — штогод праводзіцца ў Хацíслаўскім сельскім доме культуры Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Яго

арганізатарамі выступаюць дырэктар Дома культуры Г.І. Хомік і фальклорныя калектывы «Хаціславяне» і «Вясковая табала». Абрадавае дзейства яны змаглі адрадзіць амаль у першапачатковым выглядзе, выкарыстоўваючы старадаўнія гульні, песні, танцы, народны гумар. Тут пануе сапраўдная весялосць, у свяце ўдзельнічаюць амаль усе жыхары аграгарадка Хацiслаў, калядоўшчыкаў чакаюць у кожнай хаце, цікава, што велічальныя песні любяць і спяваюць розныя пакаленні жыхароў населенага пункта [7, с. 128–129].

Яшчэ адзін цікавы прыклад рэканструкцыі — калядны абрад «Куры», які пад патранажам УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы» штогод праводзіцца ў вёсках Дзмітраўка, Віркаў і Нясета Клічаўскага раёна. Яго апісвалі і спецыялісты, і аматары, якія адзначалі, што перад «старым» Новым годам абыходзілі двары дзяўчаты і хлопчыкі, падобныя на «куранятак» ці проста «кур». «Прыдуць пад вакно, — расказвае мясцовая жыхарка вёскі Віркаў Марыя Дзмітраўна Фясько, — і кажуць: “Шчодры вечар, добры вечар! Пусціця курэй папець!” У хату “куры” не йдуць, а спяваюць пад вакном калядныя песні, сярод якіх ёсць песня “Куры”» [8].

У адрозненне ад шматлікіх калядных абрадаў Беларусі, ён унікальны ўзростам удзельнікаў — курамі могуць быць толькі дзеці. Яны не водзяць з сабой пераапранутых персанажаў, як прынята на Каляды. Самі апранаюцца прыгожа, у традыцыйныя касцюмы, упрыгожваюць калядную зорку і абавязкова бяруць з сабой кошыкі, каб атрымаць шчодрыя дары. Штогод у рэканструкцыі абрада прымае ўдзел узорны фальклорны гурт «Купалачка» Дзмітраўскага філіяла дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Клічава» (мастацкі кіраўнік — Н.В. Коктыш). 02.08.2016 гэтаму ўнікальнаму абраду нададзены статус Нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Калі метад рэстаўрацыі прадугледжвае натуральнае, жывое ўзнаўленне абрадавых дзеянняў у прасторы і часе з далучэннем пераймальнікаў фальклору, а рэканструкцыі — даследаванне рэгіянальных асаблівасцей пэўнага традыцыйнага абраду і, на гэтай падставе, яго аднаўленне ў натуральным прыродным ландшафце, то метад трансфармацыі, як тып тэатралізаванага прадстаўлення, адлюстроўвае эстэтычнае пераасэнсаванне святочнага дзеяння.

**Метад трансфармацыі.** Метад трансфармацыі (ад лац. transformatio) прадстаўляе сабой «пераўтварэнне традыцыйнай формы, зместу, вербальных схем, мастацка-вобразных асаблівасцей, элементаў карнавалізацыі і маскіравання абраду» [4, с. 95]. У гэтым сэнсе выкарыстанне дадзенага метаду адкрывае шырокія магчымасці для сцэнічнай інтэрпрэтацыі народнага абрада і дазваляе прадэманстраваць сваё бачанне той ці іншай фальклорнай з’явы. Інакш кажучы, удзельнікі сцэнічнага дзеяння становяцца суаўтарам народа. Яны не проста ўзнаўляюць традыцыйны абрад, але шукаюць эстэтычныя сродкі выразнасці каб раскрыць яго міфалагічную аснову. Такое адлюстраванне абраду блізкае да пераймання, але ў той жа час «адштурхоўваецца» ад гэтага ўзноўленага аб’екта ў сферу эстэтычнага бачання і выразных сродкаў сцэны [9].

Вылучаюць наступныя прынцыпы выкарыстання метаду трансфармацыі пры стварэнні сцэнарыя народнага абраду:

тыпізацыя — знаходжанне найбольш характэрных, дамінуючых рыс народнага абрада (напрыклад, «гульня з Казой» на Каляды);

індывідуалізацыя — вызначэнне вонкавых прымет і адзнак, якія дазваляюць асэнсаваць асаблівае і абагульніць яго;

ідэалізацыя — мастацка-эстэтычнае бачанне, якое дапамагае максімальна акцэнтаваць увагу на пэўных рысах абраду (напрыклад, ідэалізацыя вясковага жыцця);

гіпербалізацыя — прыём мастацкай вобразнасці, пры якім дасягаецца ўзмацненне дынамікі, стварэнне асаблівай эмацыянальнасці, экспрэсіўнасці выканальніцкай манеры [9].

Выкарыстанне дадзеных прынцыпаў пры сцэнічным адлюстраванні народнага абраду дазваляе знайсці нестандартнае сцэнарнае вырашэнне святочнай дзеі, па-новаму выкарыстоўваць такія спецыфічныя рысы фальклору, як традыцыйнасць, вуснасць, калектыўнасць, варыятыўнасць і сінкрэтызм. У выніку гэтага трансфармуецца дынаміка развіцця народнага свята, дзе традыцыйныя формы народнага гуляння суіснуюць з рэжысёрскімі прыёмамі стварэння святочнага настрою, актывізацыі аўдыторыі і адмысловым музычным і мастацка-дэкаратыўным вырашэннем.

Такое творчае пераасэнсаванне абраду пераўтварае «рытуальную дзею ў катэгорыю драматургічнага твора відовішчных формаў (канцэрт, спектакль, тэатралізаваная дзея) і падпарадкоўвае сакральную або карнавалізаваную абрадавую дзею законам тэатральнай драматургіі» [4, с. 92]. Таму важная роля тут належыць грунтоўнай распрацоўцы літаратурнага сцэнарыя. Для гэтага выкарыстоўваюцца метафары, эпітэты, параўнанні і іншыя сродкі фальклорнай паэтыкі, а таксама пэўныя, замацаваныя традыцыяй

абрадавыя дзеянні, мастацкія матэрыялы (гульні, песні, танцы, карагоды, выказванні). Стаўленне да падзей і герояў адлюстроўвае мастацкае слова, якое апавядае пра падзеі, што непасрэдна адбываюцца перад гледачом. Усе творы аб'ядноўваюцца агульным сюжэтам, дзе маюць значэнне строгая лагічнасць пабудовы тэмы, нарастанне дзеяння, закончанасць кожнага асобнага эпізоду і раскрыццё зместу гульнёвых, карагодных, танцавальных нумароў і народных песень. Шырока выкарыстоўваюцца паказ розных старонак з народнага жыцця, фрагментаў абраднасці, а таксама падрыхтоўка адпаведных атрыбутаў народнага мастацтва і побыту (інструментаў, касцюмаў, прадметаў быту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) [10, с. 238].

**Заключэнне.** Такім чынам, у дзейнасці ўстаноў культуры для адлюстравання народных абрадаў і свят выкарыстоўваюцца метады рэстаўрацыі, рэканструкцыі і трансфармацыі. Метад рэстаўрацыі прадугледжвае ўзнаўленне абрадава-рытуальных комплексаў у традыцыйным арэоле бытавання на аснове фальклорных матэрыялаў, якія атрымалася захаваць, і этнаграфічнага апісання з удзелам носьбітаў фальклору. Метад рэканструкцыі накіраваны на даследаванне рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнага абраду і яго аднаўленне з улікам тэмпаральнага, акцыянальнага, лакатыўнага, атрыбутыўнага, персанальнага, музычнага і вербальнага кодаў. Метад трансфармацыі пераўтварае абрадавую дзею ў тэатралізаванае відовішча і падпарадкоўвае яе законам драматургіі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Дарашэвіч, Э.К. Тэорыя фальклору: навуч. дапам. / Э.К. Дарашэвіч. — Мн.: БДУКМ, 2016. — 77 с.
2. Конвенция об охране нематериального культурного наследия // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=I00300065 (дата обращения: 29.10.2025).
3. Толстой, Н.И. Славянская этнолингвистика: вопросы теории: ко Второму всероссийскому совещанию славистов, Москва, 5–6 нояб. 2013 г. / Н.И. Толстой, С.М. Толстая. — М.: Ин-т славяноведения РАН, 2013. — 240 с.
4. Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам. / А.Я. Камінскі; [сярод рэц.: С.Б. Майсяйчук, В.В. Калацэй]. — Мн.: [б. в.], 2009. — 110, [1] с.
5. Гамзовіч, Р. «Страла», «Сула», «Стрылка» як нематэрыяльная культурная каштоўнасць / Р. Гамзовіч // Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад рэд. Рымы Кавалёвай і Вячаслава Калацэя. — Мн., 2018. — С. 18–37.
6. Выскварка, С.Г. Элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Любаншчыны. Асаблівасці бытавання і захавання / С.Г. Выскварка // Сохранение нематериального историко-культурного наследия стран СНГ в контексте глобальных вызовов: междунар. науч.-практ. семинар, Минск, 15–17 нояб. 2022 г.: сб. науч. ст. / Бел. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]; редкол.: Н.В. Карчевская, А.А. Филлипов, Г.Н. Ходор. — Мн., 2022. — С. 94–98.
7. Петухова, Н.В. Фальклорна-этнаграфічныя святы ў дзейнасці ўстаноў культуры / Н.В. Петухова // Научный поиск в сфере современной культуры и искусства: материалы науч. конф. профессорско-преподавательского состава Белорусского государственного университета культуры и искусств, Минск, 25 нояб. 2021 г. / Бел. гос. ун-т культуры и искусств; [редкол.: Н.В. Карчевская (пред.) и др.]. — Мн., 2022. — С. 126–129. — Библиогр.: с. 129 (2 назв.).
8. Дзіцячы калядны абрад «Куры» Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці // Livingheritage.by:сайт. — URL: https://livingheritage.by/nks/1133/ (дата звароту: 28.10.2025).
9. Аляхновіч, А.М. Абрадавае тэатралізаванае прадстаўленне ў праграме свята: праблемы тыпалогіі / А.М. Аляхновіч // Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай культуры: матэрыялы навук. канф., Мінск, 23–24 лістап. 2011 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: В.Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. — Мн., 2013. — С. 46–54.
10. Петухова, Н.В. Асаблівасці рэжысуры фальклорных прадстаўленняў у сцэнічных умовах / Н.В. Петухова // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts: XVII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 11 мая 2023 г.: сб. науч. ст. / Бел. гос. ун-т культуры и искусств, Бел. гос. акад. музыки, Бел. гос. акад. искусств; редкол.: Н.В. Карчевская [и др.]. — Мн., 2023. — [Вып. 17]. — С. 236–239.


*Паступіў у рэдакцыю 29.10.2025*